УДК 629.735

# Мытная справа ў ВКЛ

Доўнар Л.А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Унікальнае геапалітычнае становішча ВКЛ давала магчымасць кантраляваць гандаль паміж рускімі і заходнееўрапейскімі землямі. Казна ВКЛ атрымоўвала стабільны прыбытак ад мытных плацяжоў. У пачатку 16 ст. для паляпшэння збору мыта былі створаны 11 мытных акруг. Структура мытнай акругі была наступнай: пасты мытнай варты (вёскі ці мястэчкі), падкаморы (вольныя гарады з магдэбурскім правам) і каморы (буйныя гарады, што належалі вялікаму князю ці магнату).

Для затрымання кантрабанды і спагнання прамыта на мытных пастах выкарыстоўваліся спецыяльна прыкамандзіраваныя гаспадарскія дваране. Яны ж кіравалі і антыкантрабанднай агентурнай сеткай. Непасрэдна зборам мыта займаліся адкупшчыкі – прываныя асобы, часцей яўрэйскага паходжання, якія арандавалі камору ці падкаморак. Мытны кантроль за таварам (шанцаванне) і вядзенне мытных кніг ажыццяўлялі спраўцы і пісары, прызначаныя падскарбіем земскім. Як сведчаць скаргі адкупшчыкаў, гандляры даволі часта “заніжалі мытную вартасць” тым, што на верх воза клалі дрэнны тавар, а ўнутры знаходзіўся больш каштоўны.

З сярэдзіны 16 ст. мытны тарыф ператварыўся са звычайнай ганлёвай даніны ў рэгулятар знешнегандлёвай палітыкі. Рускія гандляры , якія везлі футра, мусілі плаціць спецыяльнае мыта як пры ўвозе, так і пры вывазе тавара праз мытную мяжу ВКЛ. Таму ім стала зручней рэалізоўваць гэтае футра ў межах ВКЛ. Мясцовыя кушнеры рабілі з яго паўфабрыкат, а літоўскія гандляры бяспошлінна вывозілі яго на рынкі Юрбарка, Аўгустава і Любліна. У той жа час магнаты маглі ўвозіць абсталяванне для апрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі бяспошлінна. Так падтрымлівалася развіццё апрацоўчай вытворчасці і прадпрымальніцтва. Такім чынам, адміністрацыйнае кіраўніцтва мытнай справай ў ВКЛ сумяшчала прыватнаўласніцкую ініцыятыву і кіраванне праз дзяржаўных чыноўнікаў.